УДК 378.663.147 : 32(476.6)

# ПАЛІТЫЧНАЯ ДУМКА БЕЛАРУСІ Ў КАНТЭКСЦЕ КУРСА ПАЛІТЫЧНАЙ НАВУКІ

**Галубовіч В.У., Галубовіч В.П.**
УА "Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт"
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Пры ўсіх відавочных дасягненнях айчыннай гуманістыкі ў накірунку "*збірання*" у суцэльную плынь гісторыі прававой і палітычнай думкі Беларусі (напрыклад, даследаванне В.Ф. Шалькевіча) можна ўпэўнена сцвярджаць, што зробленае, на жаль, толькі часткова застаецца запатрабаваным студэнцтвам. Падаўляючая большасць навучэнцаў вышэйшых навучальных устаноў атрымлівае магчымасць дакрануцца да "мудрасці" нашых продкаў амаль выключна ў межах "Паліталогіі". Але нельга сказаць, што і гэта знаёмства выглядае паўнавартасным.

Па-першае, з прычыны абмежавання самога курса палітычнай навукі максімум да 18 гадзін на гісторыю палітычнай думкі проста не хапае часу, хаця логіка выкладання любой дысцыпліны патрабуе абавязковага агляду гісторыі навукі, нават дзеля таго, каб зразумець, што навуковая дзейнасць – гэта няспынны працэс, а сучаснасць – толькі прыступка на шляху ў будучыню. Такое становішча фактычна прымушае выкладчыкаў звяртаць увагу на найбольш важкія дасягненні ў гісторыі палітычнай думкі: чым не ахвяруеш дзеля большай увагі да прац Платона альбо Міколы Макіавелі? Натуральным вынікам увагі да класікаў звычайна становяцца айчынныя аўтары, на грунтоўны разбор творчасці якіх проста не стае часу.

Па-другое, далёка не ўсе зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь падручнікі нават згадваюць пра тое, што існуе "***гісторыя палітычнай думкі Беларусі***". Такі падыход, па меншай меры, выглядае дзіўным. Асновы ведаў у галіне палітычнай навукі пакліканы дапамагчы фарміраванню грамадзянскай свядомасці і лаяльнасці беларусаў адносна сваёй дзяржавы. Але што можна сфарміраваць толькі праз аднабаковы паказ эвалюцыі чужога мыслення? Несумненна, многае, але гэта падобна да свядомай адмовы ад самарэфлексіі. Больш таго, узнікае нязручная думка адносна магчымай другаснасці айчынных мысляроў, што не адпавядае рэчаіснасці. Тысячагадовая гісторыя дзяржаўнасці на беларускіх землях сама па сабе з'яўляецца доказам развіцця палітычнай думкі.

Між тым вывучэнне айчыннай палітычнай думкі – гэта надзейны падмурак для атаясамлення грамадзяніна з мінулым і сучаснасцю сваёй Айчыны. Працы нашых папярэднікаў з`яўляюцца доказам засваення нашай культурай лепшых дасягненняў антычнай і ўвогуле сусветнай палітычнай думкі. Прыкладам такой рэцэпцыі з'яўляецца творчасць Андрэя Волана (каля 1531-1610 гг.), знакамітага тэолага, палітычнага пісьменніка, аднаго з галоўных ідэолагаў кальвінізма ў Вялікім Княстве Літоўскім. Яго творы, напісаныя па-лацінску, былі вядомыя і ахвотна перавыдаваліся па ўсёй Еўропе. Да найбольш папулярных на Беларусі належаў трактат "*De libertate politica sive civili*" (1572 г.). Праз гэты твор, па-беларуску ён называецца "*Пра палітычную, альбо грамадзянскую свабоду*", можна не толькі пазнаёміцца з палітычнай дактрынай

Андрэя Волана, але і з колам падставовых ідэяў тых аўтараў, якія яго натхнялі. Чые імёны згадвае мысляр? Найбольшым аўтарытэтам ў яго карыстаюцца творцы эпохі антычнасці – Платон, Арыстоцель, Цыцэрон, Лівій, Салюсцій. Інтэрпрэтацыя і прыстасаванне іх думак да сваіх развагаў адносна сутнасці свабоды, ўлады, права, справядлівасці, уласнасці з'яўляецца падмуркам метадалогіі Волана. Для яго старажытныя аўтары былі тым апірышчам, якое дазваляла больш зразумець свой час і выпрацаваць рэкамендацыі па ўдасканаленні сучаснага яму грамадства. Абмінаючы такія творы, мы свядома збядняем гарызонты мыслення нашага студэнцтва адносна айчыннай інтэлектуальнай спадчыны.

Карысць любых ведаў напрамую залежыць ад яе практычнай значнасці для чалавека. Вывучэнне палітычнай навукі ў ВНУ слушна абумоўлена запатрабаваннем у беларускай дзяржаве носьбітаў грамадзянскай свядомасці, арыентаваных на каштоўнасці беларускага грамадства, у тым ліку на ўнікальны беларускі досвед асэнсавання палітычнага жыцця.

ЛІТАРАТУРА

1. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. Мінск, 2002. - 248 с.
2. Wolan, A. De libertate politica sive civili=O wolności Rzeczypospolitej albo ślacheckiej / A. Wolan. Warszawa, 2010. - 478 s.